Использование игровых технологий в работе библиотеки дает возможность сделать посещение библиотеки интересным и позитивным, представить библиотечное пространство в качестве площадки активного общения.

УДК 659.152(476)"1830"

**І. І. Бамбешка,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ВЫСТАВАЧНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1830-я гг.

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца першы вопыт арганізацыі прамысловых выставак на тэрыторыі Беларусі ў 1830-я гг. (па ініцыятыве афіцыйнага Пецярбурга). «Агульны план губернскіх выставак» падрыхтаваны кіраўніком Міністэрства ўнутраных спраў Д. М. Блудавым. Выстаўкі адбыліся ў такіх губернскіх гарадах, як Магілёў, Віцебск і Мінск у 1837–1838 гг. Увага надаецца выстаўцы ў Мінску, яе структуры, адметнасцям.
**Ключавыя словы:** Беларусь, Мінск, прамысловыя губернскія выстаўкі, Д. М. Блудаў, 1830-я гг.

**I. Bambeshka,**
*PhD in Culturology, Associate professor of the Department of historical and cultural heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## EXHIBITION INITIATIVES IN BELARUS IN THE 1830S.

**Abstract.** The article examines the first experience of organizing industrial exhibitions in Belarus in the 1830s. The initiative came from official St. Petersburg. The "General Plan of Provincial Exhibitions", according to which the exhibitions were to be organized, was prepared by the head of the Ministry of Internal Affairs D. Bludov. The exhibitions were held in a number of provincial cities: Mogilev, Vitebsk and Minsk in 1837–1838. The main attention is paid to the exhibition in Minsk, its structure, and features.
**Keywords:** Belarus, Minsk, industrial provincial exhibitions, D. Bludov, 1830s.

У Заходняй Еўропе прамысловыя выстаўкі атрымалі шырокае распаўсюджанне ў канцы XVIII ст. Яны арганізоўваліся перш ўсё з гандлёвымі мэтамі, рэкламуючы на рынку тыя ці іншыя тавары. Узнагароды за прадстаўленыя вырабы, публічны паказ і супастаўленне розных узораў прадукцыі садзейнічалі развіццю канкурэнцыі і стымулявалі паляпшэнне прамысловай вытворчасці.

Актыўная і паспяховая выставачная дзейнасць краін Заходняй Еўропы не магла застацца па-за ўвагай у Расіі, асабліва ў той момант,

калі ўрад засяродзіўся на развіцці айчыннай прамысловасці. Абмеркаванне мерапрыемстваў, якія б садзейнічалі яе актывізацыі, прывяло расійскія органы ўлады да думкі аб мэтазгоднасці наладжвання падобных выставак. Падобная ініцыятыва адпавядала інтарэсам і расійскага купецтва, і прамысловай буржуазіі, якая рабіла першыя крокі. У жніўні 1828 г. расійскі ўрад прыняў рашэнне перыядычна арганізоўваць прамысловыя выставы. У наступным годзе ў Пецярбургу ў «Доме экспазіцый» (каля Біржы) у памяшканні біржавога пакгаўза (склада) адкрылася першая ў Расіі прамысловая выстаўка. На ёй былі прадстаўлены вырабы цяжкай і лёгкай прамысловасці. Экспануемыя машыны і прылады былі створаны пераважна ў Пецярбургу [2, с. 80; 6].

Правілы для ўдзельнікаў першай выстаўкі, зацверджаныя Мікалаем I у 1828 г., сталі ўзорам для наступных. Надрукаваныя правілы разаслалі губернатарам, губернскім маршалкам і іншым зацікаўленым асобам з прапановай прыняць удзел у гэтай справе. Міністэрства фінансаў выдзеліла сродкі на гэтую выстаўку.

У 1836 г., у сувязі з плануемым падарожжам цэсарэвіча Аляксандра па Расіі, Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі разаслала губернатарам «Агульны план губернскіх выставак», падрыхтаваны кіраўніком міністэрства Д. М. Блудавым. Згаданы цыркуляр упершыню ў краіне вызначаў парадак арганізацыі выставак і іх склад. Паводле плана, галоўная мэта выставак была ў тым, каб «распространять на местах полезные сведения о состоянии и усовершенствовании заводской, мануфактурной, сельской и домашней промышленности, и тем самым возбуждать и поддерживать между всеми производящими классами похвальное соревнование к улучшению произведений» [3, с. 244].

План прадугледжваў, што ўсе прадметы, якія збіраліся для выстаўкі, павінны падзяліцца на 4 класы. Так, у першы клас уключаліся «прадметы царства выкапняў» (розныя пароды глебы, мінералаў, глін, руды і металы, каменны вугаль, торф і інш.). У другі клас – «прадметы царства раслін». Трэці клас мусіў складацца з узораў царства жывёл. Асобна агаворвалася, што ў склад названых класаў маглі быць уключаны і вырабы з тых ці іншых матэрыялаў (воск, ікра, тлушч і г. д.) [3, с. 246]. У чацвёрты клас уключаліся ўзоры вырабаў заводскай, мануфактурнай, фабрычнай і хатняй вытворчасці, характэрнай для губерні. План звяртаў увагу і на тое, што ў апошнім класе пажадана было экспанаваць самае лепшае, што прадстаўляла губерню.

Таксама ў плане надавалася ўвага памяшканню для экспанавання адабраных прадметаў, спосабам набыцця апошніх (наяўнасць вопісу, дзе неабходна было фіксаваць нумар прадмета па парадку, месца і аўтара яго вырабу, падрабязнае апісанне і г. д.) [3, с. 247].

Па задуме міністэрства, выстаўкі павінны былі складацца з двух раздзелаў: пастаяннага і часовага. У першы – траплялі прадметы, што

набываліся на пастаяннае захаванне для стварэння ў далейшым так званага «Губернскага кабінета ці Музеума», а ў другі – тыя прадметы, якія па заканчэнні выстаўкі неабходна было вярнуць уладальнікам [5, арк. 7]. Вялікая ўвага звярталася на арганізацыю пастаянных аддзяленняў выставак-музеумаў. Губернатары абавязваліся знасці прыстойнае і зручнае памяшканне, каб наведвальнікі маглі без перашкод аглядаць сабраныя прадметы, прасачыць за вырабам неабходных зашклёных вітрын і іншай мэблі, а галоўнае – забяспечыць належнае захаванне экспанатаў.

Намаганнямі губернскіх улад у сакавіку 1837 г. была адкрыта прамысловая выстава ў Магілёве, у чэрвені – у Мінску, а ў жніўні 1838 г. – у Віцебску [5, арк. 35, 53]. Хацелася б звярнуць больш увагі на выстаўку ў Мінску, паколькі, на наш погляд, яна была больш прадстаўнічай.

Работы па арганізацыі прамысловай выстаўкі ў Мінску пачаліся ў студзені 1837 г., і ў чэрвені адбылося адкрыццё. Як і на папярэдняй агульнарасійскай выстаўцы 1829 г., ініцыятарам выступілі дзяржаўныя структуры, канкрэтна – мясцовы губернатар. Як адзначалася вышэй, яе правядзенне было часткай маштабнага плана арганізацыі прамысловых выставак у губернскіх гарадах. Да ўдзелу запрашаліся дваране, чыноўнікі, купецтва, рамеснікі і «ўсе, якія займаліся якой-небудзь галіной прамысловасці».

У адпаведнасці з прапанаваным міністэрствам планам у першым раздзеле паказваліся ўзоры мясцовых карысных выкапняў (глеба, мінералы, руда і металы, каменны вугаль і інш.). У другім – прадстаўлены ўзоры расліннасці (дрэвы, кветкі, карысныя расліны і іх плады). Так, тут былі прадстаўлены 25 парод дрэў Мінскай губерні. У трэцім раздзеле дэманстраваліся ўзоры сыравіны, якая выкарыстоўвалася ў сельскіх промыслах. Акрамя сельскагаспадарчай прадукцыі, беларускія прадпрымальнікі экспанавалі на Мінскай выстаўцы 1837 г. розныя тавары, якія былі аб'яднаны ў чацвёрты раздзел і ў якім можна было ўбачыць лепшыя ўзоры прадукцыі мясцовых памешчыцкіх і купецкіх прадпрыемстваў (шкло, медны і керамічны посуд, паперу, цукар, тытунёвыя вырабы, шкіпідар, поташ, мыла і інш., дываны, скуру, палатно, прадукцыю 6 мясцовых суконных фабрык, у тым ліку Парэцкай фабрыкі А. С. Скірмунта) [4, арк. 1, 3–4 адв., 46–49]. Таксама прадстаўляліся такія «вырабы рамеснікаў», як гадзіннікі, музычныя інструменты, карэты, розныя пячаткі і інш., і так званыя «вырабы прыгожыя» (творы беларускага мастака Я. Дамеля, мастацкія вышыўкі, жаночыя ўборы і інш.). На Мінскай выстаўцы можна было ўбачыць і экзатычныя рэчы. Напрыклад, тут экспанаваліся з Мазырскага павета: бурштын, які знойдзены ў памешчыка І. Рудзееўскага, і зуб маманта, выяўлены каля в. Юравічы [1, с. 73].

Усяго на выстаўцы экспанаваліся 376 прадметаў, якія адлюстроўвалі першыя крокі развіцця прамысловасці Мінскай губерні. У пачатку 1839 г. значная частка прадметаў была вернута ўладальнікам. Такім

чынам, нягледзячы на патрабаванні інструкцыі міністэрства, выстаўка так і не трансфармавалася ў мясцовы прамысловы музей. Тым не менш яна падрыхтавала глебу для стварэння музеяў пры палатах дзяржаўных маёмасцей і статыстычных камітэтах, якія з'явіліся ў наступныя дзесяцігоддзі і сталі першымі мясцовымі музеямі на тэрыторыі Беларусі.


1. *Киштымов, А. Л.* Беларусь на выставках XIX – начала XX в. / А. Л. Киштымов ; науч. ред. С. П. Витязь ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исследований белорус. культуры, языка и литературы. – Минск : Беларус. навука, 2021. – 299 с.

2. *Михайловская, А. И.* Из истории промышленных выставок в России первой половины XIX в. / А. И. Михайловская // Очерки истории музейного дела в России. – М., 1961. – Вып. 3. – С. 79–154.

3. Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков : сб. док. и материалов / Рос. ин-т культурологии ; отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Этерна, 2010. – 957 с.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 197. Справа па цыркуляру МУС аб арганізацыі выставак узораў мясцовай прамысловасці.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9674. Справа ў адносінах МУС аб адкрыцці ў губернскіх гарадах выставак вырабаў прамысловасці і інш.

6. Описание Первой Публичной выставки российских мануфактурных изделий, бывшей в С.-Петербурге 1829 года. – Санкт-Петербург : тип. Экспедиции заготовления гос. бумаг, 1829. – [2], 323 с.


УДК 101.8:82-83Борхес


**В. М. Белакурскі,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
**Ж. Я. Белакурская,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*


## ХОРХЕ ЛУІС БОРХЕС: ФІЛАСОФСКІ ЎНІВЕРСУМ У БІБЛІЯТЭЧНЫМ КОСМАСЕ АРГЕНЦІНСКАГА ПІСЬМЕННІКА


**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны аналізу шэрага філасофскіх аспектаў літаратурнай творчасці аргенцінскага пісьменніка XX ст. Хорхе Луіса Борхеса, цесна звязаных з яго светапоглядам. Прасочваецца станаўленне Борхеса-мысліцеля, вылучаючы перыяд яго дзяцінства і значную ролю бацькі-настаўніка ў азнаямленні сына з суб'ектыўна-ідэалістычнымі вучэннямі заходнееўрапейскіх філосафаў XVII–XIX стст. (Дж. Берклі, А. Шапенгаўэра), ідэі якіх істотна ўплывалі на філасофскае мысленне і літаратурную дзейнасць.

Засяроджваецца ўвага на тым, што засвоеныя філасофскія ідэі прыводзяць Борхеса да пераканання ў непасрэднай залежнасці самога аўтара мастацкага твора і навакольнага свету ад сілы мыслення суб'екта творчага працэсу.